зрабіў так, як гаварылі сяляне. Для аўтара галоўнае тое, што ў выніку напружанай унутранай барацьбы перамагае ўсё ж такі сэрца, а не розум: «Пляваць мне на цябе, навука, калі ты бяссільна!» [15].

Канцэпцыю вобраза вучонага ўдакладніў і развіў у сваім рамане «Праз гады» П. Галавач, досыць шырока паказаўшы навуковае асяроддзе ў дарэвалюцыйны час і гады сацыялістычнага будаўніцтва. Супастаўленне светапогляду і лёсаў двух прафесараў, славянафіла-манархіста Пілацеева і дэмакрата Галынскага, дазволіла пісьменніку, паставіўшы вострыя пытанні, даць адказы на многія з іх.

**Заключэнне.** У беларускай прозе першай трэці XX ст. створаны шэраг мастацкіх характараў і тыпаў, якія адпавядаюць тагачаснай сацыяльнай іерархіі. Найбольш распаўсюджаны вобраз-характар — гэта просты селянін. Разам з ім у эпічнае дзеянне ўключаюцца і адукаваныя, «вучоныя» героі, да якіх сялянства выяўляе пэўны недавер, абумоўлены адносінамі да пераважнай большасці чыноўніцтва. Эпітэты «вучоны», «адукаваны» часта нясуць адбітак іроніі, маркіруюць алегарычныя вобразы, створаныя ў фальклорнай традыцыі. Недавер меў і тую прычыну, што простыя людзі не разумелі сутнасці занятку вучоных. Першыя спробы абмалёўкі іх вобразаў — гэта сімвалізацыя абстрактных ведаў, якія нібыта не здольны забяспечыць паўнату ўспрымання свету, пачуцці, фантазію (А. Платонаў). М. Гарэцкі акрэсліў вобраз старога прафесара, які спачатку кіруецца выключна аргументамі розуму, але ў выніку асабістай трагедыі пачынае асэнсоўваць і каштоўнасць сардэчных пачуццяў. Амбівалентнасць, супярэчлівасць вобраза вучонага ў паказе М. Гарэцкага засведчыла наватарства ў падыходзе да абмалёўкі гэтага вобраза як прадстаўніка сацыяльна афармленай прафесіі.

### Спіс цытаваных крыніц


1. Ядвігін Ш. Выбраныя творы. Мн. : Маст. літ., 1976. 410 с.
2. Белая А. І. Герой. Асоба. Характар : Мастацкая персаналогія ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя : манагр. Баранавічы : РВА БарДУ, 2012. 517 с.
3. Гарэцкі М. Прысады жыцця : апавяданні, аповесці. Мн. : Маст. літ., 2003. 479 с.
4. Калюга Л. Творы: раман, аповесці, апавяданні, лісты. Мн. : Маст. літ., 1992. 607 с.
5. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі ; Ін-т літ. імя Я. Купалы. Мн. : Беларус. навука, 1999. Т. 1. 583 с.
6. Платонов А. Усомнившийся Макар [Электронный ресурс]. URL: http://magazines.russ.ru/october/2004/5/plat11.html (дата обращения: 24.09.2015).
7. Бальбуров Э. А. Русская философская проза: вопросы поэтики. М. : Яз. славян. культуры, 2010. 216 с.
8. Галубок У. Творы: драматургія, паэзія, проза, публіцыстыка. Мн. : Маст. літ., 1983. 607 с.
9. Там жа. С. 46.
10. Там жа.
11. Там жа.
12. Там жа. С. 47.
13. Там жа. С. 48.
14. Там жа. С. 49.
15. Там жа.


**УДК 82-31 Рублеўская**

**І. М. Мандрыкава**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## ПРЫГОДНІЦКІЯ РАМАНЫ Л. РУБЛЕЎСКАЙ: ПРАБЛЕМА ЖАНРУ

**Уводзіны.** Шматграннасць — гэтае слова найлепш характарызуе асобу Л. Рублеўскай, якая выступае ў літаратуры як паэт, празаік, драматург, крытык. Яна працуе амаль ва ўсіх галінах літаратурна-мастацкай творчасці і мае прыкметны плён у сучаснай беларускай літаратуры.

Да творчасці Л. Рублеўскай звярнуліся такія літаратуразнаўцы, як Л. Алейнік, Г. Зенава, Т. Кабржыцкая, А. Бельскі, К. Кушнарова і інш. Аб’ектам іх даследаванняў былі «Жаночы свет у люстэрку “малой прозы”: творчыя пошукі Л. Рублеўскай і Г. Багданавай», «Роля часу ў арганізацыі мастацкага цэлага», «Жанравая спецыфіка прозы Л. Рублеўскай» і інш. Праблема жанру твораў Л. Рублеўскай патрабуе далейшай навуковай распрацоўкі. Метады даследавання заснаваны на гісторыка-літаратурным і параўнальна-супастаўляльным падыходах да вывучаемага матэрыялу.

**Асноўная частка.** Жанр прыгодніцкай літаратуры сфарміраваўся ў сярэдзіне XIX ст. Папярэднічалі яму такія літаратурныя плыні ў еўрапейскай культуры, як рамантызм і неарамантызм, народжаныя прагай экзотыкі і яркіх пачуццяў у процівагу шэрай мяшчанскай будзённасці [1, с. 78]. Галоўныя рысы прыгодніцкага рамана — выразнае дзяленне персанажаў на герояў і зладзеяў, імклівае

© Мандрыкава І. М., 2016

развіццё падзей. Сюжэту твора ўласцівыя таямнічасць і авантурнасць, героям — харызматычнасць, яркасць характараў і эмацыянальнасць [2].

Прыгодніцкая літаратура абапіраецца на досвед шматстайных літаратурна-мастацкіх апавядальных жанраў з авантурна-займальнай устаноўкай, якія атрымалі развіццё значна раней: рыцарскі эпас XII—XVI ст., раманы барока, «круцельскія» раманы, літаратура вандраванняў XVII—VIII ст. і гатычны раман перадрамантызму з яго таямніцамі і жахамі. На зараджэнне прыгодніцкай літаратуры прыкметна паўплывалі гатычныя і гістарычныя раманы В. Скота і В. Гюго. Непасрэдна ў фарміраванне прыгодніцкага жанру ўнеслі ўклад майстры неарамантычнай прозы А. Дзюма і Р. Л. Стывенсан. Спачатку ў новым жанры вылучыліся гісторыка-прыгодніцкія («Тры мушкецёры», «Каралева Марго» А. Дзюма) і сацыяльна-прыгодніцкія творы («Граф Монтэ-Крыста» А. Дзюма, «Парыжскія таямніцы» С. Эжэна). Аднымі з першых узораў прыгодніцкай літаратуры сталі «марскія» раманы Ф. Марыэта і серыя раманаў з амерыканскага жыцця Ф. Купера. Перыяд канца XIX — пачатку XX ст. стаў «залатым векам» прыгодніцкай літаратуры. Да гэтага часу з жанру ўжо вылучылася дастаткова шмат падвідаў: кнігі пра пошукі скарбаў, пра піратаў, індзейцаў, марскія раманы, каланіяльныя, шпіёнскія, рабінзанады ды інш. [3].

Як сінонім да прыгодніцкай літаратуры ўжываецца тэрмін «авантурная літаратура», якім карысталіся ў дачыненні да такіх разнародных з'яў, як познегрэчаскі раман, сярэдневяковы рыцарскі раман, плутаўскі раман, «Симплициссимус» Х. Я. К. Грымельсхаузена, разнастайныя рабінзанады, авантурна-бытавы раман XVIII ст. і інш. [4, с. 973].

Пошук адказаў на пытанні сучаснасці ў звароце да мінулага Беларусі заўсёды быў уласцівы прозе Л. Рублеўскай [5, с. 98]. Яе творы ў строгім сэнсе слова нельга назваць гістарычнымі. Гэта хутчэй спроба стварыць уласны мастацка-паэтычны свет, у якім пісьменніца імкнецца асэнсаваць мінулае, бо, як прызнаецца сама Л. Рублеўская, «цяпер я сапраўды пішу пра сябе — у любым гісторыка-сімвалічным антуражы» [6, с. 357]. Рэальнае, рамантычнае, містычнае, легендарнае, міфалагічнае цесна пераплецены ў прозе пісьменніцы. Яе творам характэрна авантурнасць і таямнічасць [7, с. 35].

Асаблівасцю прыгодніцкіх раманаў Л. Рублеўскай з'яўляецца шырокі зварот да мінулага Беларусі. Героі яе кніг разгадваюць таямніцы беларускай гісторыі, шукаюць скарбы, самаахвярна змагаюцца і за Радзіму, і за каханне. Так, гераіня аповесці «Сэрца мармуровага анёла» (2000) мастацтвазнаўца Кася, у рукі якой падчас пошуку «каштоўных экспанатаў» у адным з правінцыяльных краязнаўчых музеяў трапляе чорная жамчужына каралевы Боны, сама заўважае: «Люблю вандраваць. Часам гэтая схільнасць ублытвае мяне ў авантурныя падзеі…» [8, с. 118].

Наступная асаблівасць прыгодніцкага рамана Л. Рублеўскай — выкарыстанне фантасмагорыі — «мудрагелістага вар'яцкага бачання» [9, с. 937]. Арыгінальны сюжэт мае прыгодніцка-фантасмагарычная трылогія Л. Рублеўскай пра Пранціша Вырвіча. У першай яе частцы, «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега», чытач сустракаецца са збеглым вучнем Менскага езуіцкага калегіюма Пранцішам Вырвічам і доктарам Баўтрамеем Лёднікам з Полацка, якіх лёс заносіць у сутарэнні Слуцка, Менска і Полацка. Яны выратоўваюць Сільфіду (Саламею), пра якую думае Геранім Радзівіл, што гэта крылатая дзева, якая можа прынесці яму славу: «Крылы ейныя мне без патрэбы! Зрабі, каб усміхалася і не губляла прытомнасць! А са сваім папярэднікам ты і так ужо знаёмы — ён тыдні два вісіць на слупе ў двары. Так што кансіліум праводзь, колькі хочаш! А зараз мне трэба, каб гэты… дух змог устаць на зямныя ногі і, не кульгаючы, з прыемным выразам твару, прайшоў туды, куды я захачу!» [10, с. 111]; здабываюць дзіду святога Маўрыкія: «Дзіда. Дзіда святога Маўрыкія. Некаторыя лічаць, што гэта менавіта тая зброя, якой сотнік Лангін на Галгофе прабіў бок Госпада нашага Ісуса Хрыста, калі той канаў на крыжы. Але хутчэй за ўсё яна належала святому Маўрыкію з хрысціянскага рымскага легіёна, знішчанага на загад імператара. Паводле легенды, варты ўладання гэтай святыняй чалавек набудзе асаблівую мудрасць і Боскае апякунства» [11]. У Л. Рублеўскай героі змагаюцца за ўласны гонар і Радзіму.

У другой частцы, «Авантуры студыёзуса Вырвіча» (2014), у адпаведнасці з «законамі» прыгодніцкага жанру героі вандруюць праз усю Еўропу XVIII ст., трапляюць у складаныя сітуацыі і выблытваюцца з магнацкіх інтрыг вакол трона Рэчы Паспалітай [12]. «Авантуры» складаюць адзіны мастацка-літаратурны праект, які вызначаецца беларусацэнтрычным поглядам на мінулае.

Элементы фантасмагорыі бачны не толькі ў «мудрагелістасці» інтрыг, значна аддаленых ад чытача ў часе. У творах дзейнічаюць незвычайныя істоты. У «Авантурах студыёзуса Вырвіча» герой Л. Рублеўскай змагаецца з цмокам: «Так, ён быў там! Самы сапраўдны жывы цмок… Святло скупа прасявалася на яго скрозь маленькія вокны ў столі. Які ён быў велізарны! І нейкі… Нібыта пакрыты плесняй. Бляклыя вочы, як сляпыя — а дзе ж у іх агонь? Дый з пашчы агню не паказвалася… Затое пашча здаровая! Палова Пранціша ў яе дакладна б змясцілася. Галава цмока была падобная адначасова і на змяіную, і на вялізную конскую. А што найбольш дзіўна, не было і крылляў! Можа, яны проста складзеныя, як у кажана? Лускі таксама, наколькі Вырвіч разгледзеў, не мелася — зморшчаная бляклабрунатная скура» [13, с. 161].

У кнізе «Авантуры студыёзуса Вырвіча» на першы план выходзяць уласна авантурныя прыгоды герояў, таму з пазіцый класічнай прыгодніцкай літаратуры гэтая кніга выглядае больш традыцыйнай. Тыповай прыкметай прыгодніцкага жанру з'яўляецца тое, што падзеі разгортваюцца вакол пэўнага артэфакта. У Л. Рублеўскай — вакол кароны святога Альфрэда, украдзенай з англійскай скарбніцы падчас рэвалюцыі, што прывяла да ўлады Кромвеля.

Авантурнасць у разгортванні сюжэта раманаў выразна выяўляецца і ў эпізодах, звязаных з каханнем герояў. У першых дзвюх кнігах у кожнага — і ў Вырвіча, і ў Лёдніка — мелася адна дама сэрца: адпаведна, Саламея Рэніч і Паланэя Багінская. Абставіны складваліся так, што доктар здраджваў уласнай жонцы. Аказваецца, што ў Лёдніка ёсць па-за шлюбам народжаны сын ад яго даўнішняй палюбоўніцы, муж якой быў першапачаткова гаспадаром Лёдніка. У душы ён па-ранейшаму кахаў Саламею. Што тычыцца Вырвіча, дык яго пачуцці ў адносінах да Паланэі Багінскай заставаліся без адказу. У трэцяй кнізе Л. Рублеўскай «Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча» шляхціца кахае і сціплая прыгажуня Ганна Макавецкая (калісьці яна служыла камерысткай у Багінскіх, потым яе ўдачарыла шляхцянка, таму Ганна стала багатай нявестай), і эфектная прыгонная актрыса Раіна Міхалішыўна, якая належыць чорнаму магу, графу Батысту. Дзякуючы інтрыгуючым сюжэтным паваротам жаночыя вобразы атрымліваюць дадатковыя адценні, больш цікава раскрываюцца характары галоўных герояў, якія павінны рабіць выбар, у сюжэце з'яўляецца дадатковая інтрыга.

Першапачаткова ў друку анансавалася, што «Авантуры драгуна» [14] стануць апошняй часткай цыкла пра Вырвіча і Лёдніка, але Л. Рублеўская пакінула фінал рамана адкрытым. У 2015 г. выйшла чацвёртая частка тэтралогіі «Авантуры Пранціша Вырвіча, здрадніка і канфедэрата», якая стала працягам «Авантур».

**Заключэнне**. Л. Рублеўская творча выкарыстоўвае традыцыі прыгодніцкага рамана. Яе творам уласціва таямнічасць, авантурнасць сюжэта, харызматычнасць і яркасць характараў герояў. Разам з тым жанр прыгодніцкага рамана Л. Рублеўскай мае развіццё. Жанравая мадыфікацыя праяўляецца ў шырокім выкарыстанні гістарычнага матэрыялу, элементаў фантасмагорыі.

### Спіс цытаваных крыніц


1. Адамовіч А. Беларускі раман: станаўленне жанру. Мн., 1961. 180 с.
2. Благой Д. Исторический роман [Электронный ресурс] // Фундам. электрон. б-ка «Русская литература и фольклор». URL: http://feb-web.ru/feb/slt/abc/lt1/lt1-3351.htm (дата обращения: 01.09.2015).
3. Там же.
4. Наркевич А. Ю. Приключенческая литература // Краткая литературная энциклопедия / гл. ред. А. А. Сурков. М. : Совет. энцикл., 1968. Т. 5. 989 с.
5. З росных сцяжын: аўтабіяграфіі пісьменнікаў Беларусі / уклад. М. Мінзер. Мн. : Літ. і мастацтва, 2009. 464 с.
6. Грушэцкі А. Далёкія астравы, згубленыя скарбы // ЛіМ. 2014. № 45. С. 16.
7. Бельскі А. Сучасная літаратура Беларусі : дапам. для настаўнікаў. Мн. : Аверсэв, 2000. 127 с.
8. Рублеўская Л. І. Сэрца мармуровага анёла. Мн. : Маст. літ., 2003. 427 с.
9. Ожегов С. И., Шведова Н. Ю. Толковый словарь русского языка: 80 000 слов и фразеологических выражений. 4-е изд., доп. М. : Азбуковник, 1999. 944 с.
10. Рублеўская Л. І. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега: раман прыгодніцкі і фантасмагарычны. Мн. : Звязда, 2012. 272 с.
11. Там жа. С. 95.
12. Грушэцкі А. Далёкія астравы, згубленыя скарбы. С. 10.
13. Рублеўская Л. І. Авантуры студыёзуса Вырвіча: раман прыгодніцкі і фантасмагарычны. Мн. : Звязда, 2014. 320 с.
14. Рублеўская Л. І. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча: раман прыгодніцкі і фантасмагарычны. Мн. : Звязда, 2014. 320 с.


**УДК 882.6.09(091)(075.8)**

**І. С. Мялік**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## АДНОСІНЫ ДА РЭЧАЎ У КАНЦЭПЦЫІ ГЕРОЯ АПАВЯДАННЯ Л. КАЛЮГІ «НЕЗНАШОНЫЯ БОТЫ»

**Уводзіны.** Літаратура эстэтычна асвойвае свет у мастацкім слове. Яе вечнай тэмай і прадметам з'яўляюцца жыццё чалавека ў народзе і жыццё народа ў свеце, чалавек, прырода і грамадства ў іх узаемадзеянні. Мастацкі свет пачуццёва дакладны і матэрыяльна насычаны. Самыя, здавалася б, нязначныя, пабочныя дэталі, з'явы, учынкі, рысы характару герояў у ім служаць рэпрэзентацыі галоўнай ідэі твора, а таму выпадковымі не з'яўляюцца. «Рэчы мастацкага свету падпарадкаваны яго ўнутранай логіцы і задачы ўздзеяння на чалавека ў патрэбным эстэтычным напрамку» [1, с. 305]. Рэчы (прадметы і аб'екты рэчаіснасці) гэтак жа, як і прыродныя стыхіі, і характары, і абставіны, з'яўляюцца абагульненымі, канцэптуальна нагружанымі вобразамі, якія псіхалагічна, эстэтычна, па-філасофску ўздзейнічаюць на чалавека. Рэч некім зроблена, некаму належыць, выклікае да сябе пэўныя адносіны, робіцца крыніцай уражанняў, перажыванняў, роздуму. Як адзначае У. М. Тапароў, «у рэчы ёсць свая доля, у якой яна дыктуе сваю волю чалавеку. Не толькі чалавек — мера ўсіх рэчаў, але ў пэўнай ступені і наадварот: рэч — мера ўсіх людзей» [2, с. 70].

© Мялік І. С., 2016